ДУК “ Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк”

2022

ліпень

# Бібліятэчны веснік















**Інфармацыйны веснік**

**1 ліпеня** бібліятэкары **Бычыхінскай сельскай бібліятэкі** правялі для дзяцей і падлеткаў вёскі **гістарычны партрэт “Імя на абеліску”,** прысвечаны Герою Савецкага Саюза Івану Мікалаевічу Антонаву. У 2022 годзе ДУА “Бычыхінская сярэдняя школа” было прысвоена імя І. М. Антонава. Вядома ж гэта не выпадкова. Прысутныя даведаліся аб мужнасці і подзвігу чалавека, які аддаў жыццё за вызваленне іх роднага краю ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Таксама бібліятэкар расказаў аб месцы пахавання Івана Мікалаевіча на брацкіх могілках у вёске Мехавое і мемарыяльным знаку, які ўсталяваны на месцы гібелі героя ў вёсцы Быкі Бычыхінскага сельскага савета дэпутатаў.

**3 ліпеня** наша краіна адзначыла галоўнае дзяржаўнае свята - Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Да святкавання гэтай даты далучыліся бібліятэкі Гарадоцкай сеткі.

**1 ліпеня** бібліятэкар **Даўгапольскай сельскай бібліятэкі** сумесна з Даўгапольскім сельскім саветам і ДУК “Цэнтр традыцыйнай культуры і народнай творчасці Гарадоцкага раёна” філіял Даўгапольскі сельскі дом культуры **правялі мітынг “Край мой – гордость моя”,** прысвечаны Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Падчас мерапрыемства бібліятэкар расказала жыхарам аграгарадка Даўгаполле пра чырвонаармейца Пугіна З. І. і 74 невядомых воіна 259 СП, якія загінулі ў баі з нямецкага-фашысцкімі захопнікамі ў кастрычніку 1941 года абараняючы вёску Даўгаполле.



**1 ліпеня** дзеці са спартыўна-аздараўленчага лагера ТАК “Лосвіда” адправіліся разам з бібліятэкарам **Прудніцкай сельскай бібліятэкі** ў сапраўдны **пешы паход “Подвиг ценою в жизнь”,** прымеркаваны да Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь і 78-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Першым пунктам прызначэння стаў абеліск, які устаноўлены ў вёсцы Пруднікі ў памяць аб 300 земляках, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Потым усе разам наведалі Алею Герояў у горадзе Гарадку і даведаліся аб кожным з 13 гарадакчан удастоеных высокіх дзяржаўных узнагарод у гады Вялікай Айчыннай вайны і мірны час. Працягнуўся шлях ўдзельнікаў пахода наведваннем абноўленага Мемарыяльнага комплексу “Пантэон памяці” ва ўрочышчы Вараб'ёвы горы, які прысвечаны мірным жыхарам, забітымі фашысцкімі карнікамі. На працягу ўсяго падарожжа бібліятэкар цікава і падрабязна расказвала дзецям гісторыю цяжкага лёсу Гарадоцкага раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны.









У рамках раённага гісторыка-**краязнаўчага праекта “Вехи истории родного края”**, распрацаванага супрацоўнікамі аддзела бібліятэчнага маркетынгу Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі і прымеркаванага да Года гістарычнай памяці, да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь у сельскіх бібліятэках сеткі былі аформлены **фотавыставы “А я люблю места свои родные”.** На працягу тыдня чытачы мелі магчымасць убачыць на выставах самыя прыгожыя месцы свайго краю, пазнаёміцца з буклетамі краязнаўчай тэматыкі і паўдзельнічаць у папаўненні “экспанатаў”. Былі прадстаўлены фотаздымкі любімых куткоў роднай вёскі. Таксама выставы была магчымасць убачыць і наведаўшы афіцыйныя сацыяльныя сеткі бібліятэк.



Даўгапольская сельская бібліятэка




Езярышчанская гарпасялковая бібліятэка




Дубраўская сельская бібліятэка



Межанская сельская бібліятэка

**3 ліпеня** супрацоўнікі **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** прынялі ўдзел у гарацкім свяце, прымеркаваным да святкавання Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь і 78-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На цэнтральнай плошчы горада гучала віншавальная радыёгазета “Пад блакітным небам Беларусі”, падрыхтаваная бібліятэкарамі. Увагу прыцягвала **выстава-інсталяцыя “Нам засталася спадчына...”.**



Фотазона ў бібліятэкі – гэта добры спосаб прыцягнуць ці заняць чытачоў і стварыць станоўчы імідж бібліятэкі, які ўжо добра асвоілі бібліятэкары. На працягу ліпеня бібліятэкары Гарадоцкай сеткі прынялі ўдзел у раённым **аглядзе-конкурсе бібліятэчнага майстэрства “Время читать”** на лепшае афармленне фотазоны ў бібліятэцы, які быў распрацаваны супрацоўнікамі аддзела бібліятэчнага маркетынгу Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі. Кожны ўдзельнік праявіў свае творчыя здольнасці і фантазію. Галоўнай умовай конкурсу была папулярызацыя кніг і чытання, што вядома ж улічылі бібліятэкары пры стварэнні фотазоны. Чытачы былі прыемна здзіўлены, што прыйшоўшы ў бібліятэку, яны змаглі ўзяць не толькі цікавую кнігу, але і зрабіць яркае, пазітыўнае фота. Прыгожыя фотаздымкі ўпрыгожылі старонкі бібліятэк ў сацыяльных сетках.




Езярышчанская
гарпасялковая бібліятэка



Даўгапольская сельская
бібліятэка




Бычыхінская сельская бібліятэка




Межанская сельская бібліятэка



Пальмінская сельская бібліятэка




Дубраўская сельская бібліятэка




Віраўлянская сельская бібліятэка

Купалле адно з любімых фальклорных свят у вёсках. Каб "адшукаць папараць-кветку" бібліятэкары арганізуюць для сваіх карыстальнікаў мерапрыемства розных форм.

**6 ліпеня** бібліятэкары **Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэкі** сумесна з супрацоўнікамі ДУК "Цэнтр традыцыйнай культуры і народнай творчасці Гарадоцкага раёна" філіял Езярышчанскі гарпасялковый дом культуры арганізавалі і правялі **тэатралізаваны паказ "На Купала ночка мала".** Падчас мерапрыемства госці і жыхары пасёлка прынялі ўдзел у займальных пошуках карты, каб даведацца дзе расце папараць-кветка. А ўсе прадстаўнікі "нячыстай сілы" ладзілі ім мноства выпрабаванняў і перашкод. Было праведзена мноства вясёлых конкурсаў, а ў канцы па традыцыі запалілі вогнішчы і працягнулася купальская ноч дыскатэкай.





**7 ліпеня** на вуліцы каля **Межанскай сельскай бібліятэкі** бібліятэкар правяла **гадзіну фальклору "Купальскія забавы".** Прысутныя пазнаёміліся са звычаямі святкавання дня Івана Купала. Гулялі ў традыцыйныя гульні, адгадвалі тэматычныя заданні, плялі купальскія вянкі.





**7 ліпеня** супрацоўнікі **Бычыхінскай сельскай бібліятэкі** запрасілі жыхароў вёскі на **гутарку-знаёмства з мастаком “Души изменчивой приметы”.** Бібліятэкары расказалі прысутным аб біяграфіі і творчасці рускага жывапісца Марка Шагала- выдатнага мастака XX стагоддзя, які нарадзіўся ў горадзе Віцебску. Таксама ўдзельнікам мерапрыемства былі прапанаваны кнігі з фонду бібліятэкі, з якіх можна даведацца больш пра стыль напісання картын і лёс гэтага неардынарнага чалавека.






**7 ліпеня** бібліятэкар **Дубраўскай сельскай бібліятэкі** запрасіла чытачоў у **літаратурнаю гасцёўню “Паэт беларускай зямлі”**, прымерканую да 140-годдзя з дня нараджэння беларускага паэта Янкі Купалы. Дзяці пазнаёміліся **з** галоўнымі фактамі біяграфіі класіка сусветнай і беларускай літаратуры, яго творчым лёсам, а таксама **з** кнігамі, змешчанымі на выставе, прысвечанай юбілею народнага песняра. На працягу мерапрыемства гучалі беларускія вершы.




Езярышчанская
гарпасялковая бібліятэка

**9 ліпеня** наведвальнікаў аздараўленчага лагеру “Звезда”, які працаваў пры ДУА “Межанскі дзіцячы сад-сярэдняя школа імя А.Я. Казлова” бібліятэкар **Межанскай сельскай бібліятэкі** запрасіла на **актуальны дыялог “Интернет – свобода и ответственность”.** Прысутныя абмеркавалі правілы адказных і бяспечных паводзін у сучасным інфармацыйным асяроддзі, успомнілі правілы этыкету ў віртуальнай сетцы. Былі пералічаны плюсы і мінусы Інтэрнэта, агучана праблема інтэрнэт-залежнасці і магчымыя шляхі яе вырашэння. Таксама была нададзена ўвага, такой з'яве як булінг у сетцы Інтэрнэт і што рабіць калі падлетак стаў яго ахвярай.

Таксама, ў рамках праграмы “Библиолето”, у ліпені для дзяцей прайшлі мерапрыемства: **гадзіна краязнаўства “Мой город любимый, ты северная столица”, інфармацыйна-пазнавальная гадзіна “Сюрпризы дремучего леса”.**













**15 ліпеня** адной з цэнтральных падзей Міжнароднага фестывалю “Славянскі базар 2022” стаў традыцыйны конкурс брэндаў рэгіёнаў. **Гарадоцкая цэнтральная раённая бібліятэка** разам з установамі культуры Гарадка прадставілі сумесную пляцоўку з Усвяцкім раёнам Расійскай Федэрацыі на свяце народнай культуры і традыцый “Гуляй, народ”. Брэндавым фестывалем Гарадокшчыны з'яўляецца раённы фестываль народнай творчасці, паэзіі і фальклору “Гарадоцкі Парнас”, прысвечаны знакамітаму земляку Канстанціну Вераніцыну, які напісаў паэму “Тарас на Парнасе”. Для гасцей свята была прадстаўлена фотавыстава з самымі яркімі момантамі фестывалю. Для дзяцей і дарослых работнікі бібліятэкі арганізавалі займальныя забавы: выпрабаваць удачу ў бяспройгрышнай жартоўнай латарэі і даведацца будучыню, сарваўшы “чарадзейны” яблык з дрэва прадказанняў. Свята прайшло ярка і весела, пакінуўшы пасля сябе шмат незабыўных уражанняў. Па выніках конкурсу брэндаў рэгіёнаў Гарадоцкая пляцоўка была адзначана дыпломам першай стэпені.



**21 ліпеня** супрацоўнікі **Бычыхінскай сельскай бібліятэкі** і ДУК “Цэнтр традыцыйнай культуры і народнай творчасці Гарадоцкага раёна” філіял Бычыхінскі сельскі дом культуры павіншавалі супрацоўнікаў Бычыхінскага пажарнага аварыйна-выратавальнага паста № 12са святам, прысвечаным Дню пажарнай службы. Падрыхтавалі музычнае віншаванне, бібліятэкары прадставілі для гасцей свята **кніжную выставу “Наши ангелы – спасатели”** і правялі агляд часопіса “Юный спасатель”, а пажарныя дэманстравалі сучасную аварыйна-выратавальную тэхніку.





**22 ліпеня** супрацоўнікі **аддзела дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** аб’явілі для сваіх чытачоў Днём сяброў. Пагутарыць, пагуляць, весела правесці час, пагаварыць аб сяброўстве і сябрах прыйшлі юныя выхаванцы ДУА “Яслі-сад №2 г. Гарадка” на **гадзіну сяброўскіх зносін “Без друзей меня чуть-чуть, а с друзьями много”.** Дзеці разам з вядучай мерапрыемства пагаварылі аб тым, што значыць для іх сяброўства, якімі якасцямі павінен валодаць сапраўдны сябар. Дзеці ўзгадалі верных сяброў з літаратурных твораў, паслухалі вершы, з задавальненнем танчылі пад песеньку “У друзей нет выходных”. Сустрэча была завершана праглядам мультфільма “Колючая дружба”.



**27 ліпеня** бібліятэкар **Віраўлянскай сельскай бібліятэкі** сабрала дзяцей на **казачны марафон “Сказочная страна. Знаете где она?”.** Прысутныя ўспомнілі любімыя казкі, удзельнічалі ў конкурсах, адказвалі на пытанні казачнай віктарыны, адгадвалі загадкі, разам малявалі казачных герояў.









**29 ліпеня** бібліятэкары **Бычыхінскай сельскай бібліятэкі** ў рамках мэтавай праграмы “В интересах села” прадставілі сваім чытачам **выставу “Бібліятэка - героям жніва”,** на якой у рамках мэтавай праграмы прадставілі сваім чытачам выставу, на якой была магчымасць убачыць літаратуру і перыядыку па розных кірунках сельскай гаспадаркі. Таксама цікавай для ўсіх стала тэматычная інфармацыя “З летапісу саўгаса імя Свярдлова”, сабраная бібліятэкарамі за шмат гадоў.



**30 ліпеня** ў Бычыхінскай сельскай бібліятэцы для людзей пенсіоннага ўзросту быў падрыхтаваны **час рэкламы “Весь хоровод журналов”**, дзе бібліятэкар пазнаёміла прысутных з разнастайнасцю часопісаў, што паступаюць у бібліятэку, зрабіла агляд апошніх нумароў. Кожны выказаў сваё меркаванне аб перавазе ў чытанні перыёдыкі, распавёў аб самым цікавым, прачытаным нядаўна.

**30 ліпеня** ў турысцка-аздараўленчым комплексе “Лосвіда” адбылася **конкурсна-гульнявая праграма “Кірмаш у пана Любашчынскага”**, арганізаваная супрацоўнікамі ДУК “Цэнтр традыцыйнай культуры і народнай творчасці Гарадоцкага раёна”. У свяце прыняла ўдзел бібліятэкар Прудніцкай сельскай бібліятэкі Каржова Л. А. Для прысутных на мерапрыемстве была падрыхтавана выстава “Сцежкамі роднага краю”, дзе кожны жадаючы мог пазнаёміцца з фатаграфіямі, па якіх можна даведацца пра гісторыю вёскі Пруднікі і яе наваколля. Любоў Аляксандраўну не дарма лічаць мясцовым краязнаўцам, яна шмат гадоў збірае краязнаўчы матэрыял пра родныя мясціны: звярталася ў раённы і абласны архівы, прымала ўдзел у краязнаўчых канферэнцыях. Таксама каштоўным рэсурсам з'яўляюцца і апавяданні мясцовых жыхароў. Вынікам доўгай і карпатлівай работы стала распрацоўка двух экскурсійных маршрутаў. Таму лепш, чым мясцовы бібліятэкар расказаць пра пана Любашчынскага і ўнікальнасць родных мясцін, гасцям свята не змог бы ніхто. Цікавасць у прысутных на свяце выклікалі і драўляныя самаробныя кнігі “Тарас на Парнасе” і “7 цудаў Лосвіда”, выраблены бібліятэкарам, з якіх можна даведацца яшчэ не адну таямніцу Прудніцкай зямлі.

